**МАЗЫРСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

пл Леніна, 16, 247760, г. Мазыр
тэл: 8(0236) 32-21-40, факс 32-51-84

разліковы рахунак 3604400160072, УНП 400036117
філіял № 317 ААБ "Беларусбанк" г. Мазыра

**МОЗЫРСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

пл. Ленина, 16, 247760 г. Мозырь
тел. 8(0236) 32-21-40, факс 32-51-84

расчетный счет 3604400160072, УНП 400036117
филиал № 317 АСБ "Беларусбанк" г. Мозыря

22.06.2022 № Я-263ал/кол/764

на № ____________ ад ____________

(для паведамлення іншых)

Мазырскі раённы выканаўчы камітэт на Ваш электронны зварот паведамляе наступнае.

Спецыялістамі ўчастка па зялёным будаўніцтве дзяржаўнага прадпрыемства «Мазырскі райжылкамгас» была праведзена абрэзка дрэў па вул.Інтэрнацыянальная ў раёне крамы «Нафтавік» у г.Мазыры, так як дадзеныя дрэвы былі паражаны амелой больш чым на 50%, дыяметры якой складалі ад 30 да 60 см. Таксама прысутнічала амела на шкілетных галінах дыяметрам ад 2 да 5 см, што ў наступстве прывяло б да росту і павелічэнню памеру паўпаразіта. Была часткова праведзена санітарная абрэзка дрэў, згодна з п.33 Пастановы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь ад 13.01.2020г. №1 "Аб зацвярджэнні правілаў утрымання азелянёных тэрыторый" (далей Правілы), які прадугледжвае выдаленне сухіх, старых, хворых, пашкоджаных і пераплеценых пабегаў і галін, а таксама галін, накіраваных унутр кроны, або зблiжаных адзін з адным да здаровага месца дрэва. Часткова была праведзена і амаладжальная абрэзка дрэў (п.35 Правілаў), якая праводзіцца з мэтай павышэння працягласці жыцця раслін шляхам частковага або поўнага выдалення сукоў старой кроны. Таксама гэты від абрэзкі прымяняецца ў дачыненні да патэнцыйна небяспечных дрэў з невялікім нахілам і (або) вялікай вышынёй, якія растуць каля тратуара, над праезнай часткай, каля прыпыначных пунктаў, альбо сухавяршынных на 55-60%, калі рост дрэва саслаблены. Дрэвы, якім была праведзена абрэзка, валодаюць добрай здольнасцю росту пабегаў, што азначае ў наступным, у дрэў з'явяцца новыя маладыя парасткі, якія ствараюць новую крону.

Разам з гэтым паведамляем, што работы па абрэзцы аб'ектаў расліннага свету выконваюцца падрыхтаванымі спецыялістамі.

На падставе вышэйпададзенага ў дзеяннях службовых асоб дзяржаўнага прадпрыемства "Мазырскі райжылкамгас" парушэнняў не ўстаноўлена.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў", рашэнне па звароту можа быць абскарджана ў вышэйстаячы орган: Гомельскі аблвыканкам, пр. Леніна, 2 г.Гомель.

Намеснік старшыні Д.У. Мілер

Шыла 23 45 30
Гнедзька 20 61 94